агитационных мероприятий, взаимодействия с политическими партиями. На протяжении 70 лет существования движения было несколько суфражистских организаций – *Национальная женская суфражистская ассоциация* и *Американская женская суфражистская ассоциация* в период 1869 – 1890 гг., объединенная *Национальная американская женская суфражистская ассоциация* с 1890 по 1920 г., а также организация молодых активисток движения *Конгрессиональный союз за женское избирательное право* (1913), впоследствии – *Национальная женская партия* с 1916 г.

Предоставление женщинам избирательного права было связано, в частности, с изменением общественного мнения по данному вопросу, а также с поддержкой основных политических партий страны, от которых зависело прохождение в Конгрессе США федеральной поправки к Конституции. Широкая общественная деятельность суфражистских организаций – лекции, митинги, суфражистские парады и т.д. – содействовала принятию обществом в целом идеи предоставления женщинам избирательного права. Это, в свою очередь, повлияло со временем на политические партии, которые были заинтересованы в голосах будущих избирателей. Если на рубеже веков вопрос о женском избирательном праве поддерживали далеко не ключевые политические силы в американской системе (популисты, социалисты и т.д.), то уже к выборам 1912 г. двое кандидатов в президенты (Юджин Дебс, Теодор Рузвельт) заявили о своей поддержке, а в предвыборных штабах Демократической и Республиканской партий были созданы женские бюро для политической деятельности в тех штатах, где женщины могли голосовать, а в 1912 г. в США было уже 9 штатов, предоставивших женщинам право голоса по своим конституциям.

Анализ материалов позволяет сделать вывод о том, что суфражистские организации добились поддержки ведущих политических партий только на том этапе своей деятельности, когда стало очевидно, что предоставление женщинам избирательного права – лишь дело времени, и партии начали по существу борьбу за привлечение будущих сторонников. Вместе с тем деятельность в сотрудничестве и противостоянии с сильными партиями, существование комитета суфражисток, который действовал в Конгрессе, давали определенный опыт и усиливали позиции суфражистских организаций. В 1919 г. с принятием XIX поправки к Конституции США их деятельность увенчалась успехом: женщины страны получили избирательное право.

## ПУСТЫНСКІ УСПЕНСКІ МАНАСТЫР (МУЖЧЫНСКІ)

***Лобусь А.Н.***
Навуковы кіраўнік – к.гіст.н., дацэнт ***А.Ц. Арбузаў***
*Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт*

Заснаваны у 1380 г.мсціслаўскім князем Сямёнам Лугвенам у 11 км ад горада. Стаіць на правым беразе ракі Аслянка, на месцы, дзе згодна паданню з'явіўся цудадзейны вобраз ( так званы патрыяршы), а з-пад зямлі пачала біць крыніца з гаючай вадой.

Старажытнае паданне сведчыць, што адзін з князёў мсціслаўскіх, верагодна, Сямён, моцна захварэў на вочы. Ні дактары, ні народныя сродкі – нішто не дапамагло. Закрылася святло для вачэй князя і душа яго апусцілася ў цемру. Адзіным суцяшэннем, адзінай радасцю заставалася толькі цёплая, сардэчная малітва. Ён доўга маліўся, просячы дапамогі ў нябёсаў, і малітва нарэшце была пачута. Калі хворы князь спаў ціхім сном, перад вачыма яго паўстаў стары і сказаў: "Калі жадаеш стаць відучым, ідзі ў пустынь і памыйся там вадой з крыніцы, атрымаеш жаданае". Князь доўга распытваў у людзей аб пустыні з крынічкаю, але не змог атрымаць дакладнага адказу. І вось знайшоўся вельмі стары чалавек: "Я ведаю гэтае месца і ахвотна павяду цябе туды ". Прывёў да крыніцы: " Выпі гэтай крынічнай вады. А потым памый ёю свае вочы. Ну што? " "Я бачу, як сюды скачуць мае страмянныя. " Заўтра на ранняй зорцы прыязджай зноў. І так кожны дзень шэсць тыдняў запар "Князь стаў бачыць настолькі добра, што змог весці палкі ў час бітвы на Грунвальдзе. Узрадаваны ён падараваў Пустынь з гаючай крыніцай манахам, шчодра даў са сваёй казны на будаўніцтва манастыра, а старцы прызначыў ігуменам.

У пачатку XVI ст. манастыру належалі вёскі Аўдзейкава, Радзівонаўка, Слабада. Рацукоўская, Перасадзіна, сенажаці за рэкамі Віхра і Сож, пожня Горабская, двор і прысядзібны ўчастак у Мсціславе, вялікая колькасць сялян. Ён меў правы на лоўлю рыбы, баброў, звяроў, свабодную пабудову млыноў на рацэ Віхры, самастойны суд над манастырскімі сялянамі. Пустынскі манастыр у 1601 перайшоў да уніятаў і быў заселены манахамі базыльянскага ордэна, а у 1839 г. пасля скасавання на Беларусі уніі, стаў праваслаўным. У канцы XVIII ст - пач.XIX ст. манастыр быў перабудаваны і складаўся з Успенскага сабора манастырскага корпуса з царквой, званіцы, школы, капліцы дзвюх гаспадарчых пабудоў і трох жылах дамоў.

Успенскі сабор, узведены уніяцкім архіепіскапам Іракліем Лістоўскім у пачатку XIX ст. (1801-1808), захаваўся толькі часткова. Гэта трохнефная базіліка з адной прамавугольнай апсідай. Галоўны фасад быў аздоблены плоскімі пілястрамі, іанічнымі капітэлямі і завершаны трохвугольнымі франтонамі. Сабор у мінулыя гады меў фрэскавы роспіс.

Званіца пабудавана ў другой палове XIX ст. і ўяўляе сабой высокую пяціярусную пабудову некалі завершаную шпілем. Адначасава са званіцай непадалёку ад штучнай сажалкі пабудавалі капліцу ў выглядзе маленькага аднанефнага храма з паўкруглай апсідай.

Цагляны манастырскі корпус пабудаваны на мяжы XVIII – XIX ст. Ён мае выгляд двухпавярховага Г-падобнага будынка, злучанага з аднанефнай крыжова-купальнай царквой. Корпус школы ўзведзены ў другой палове XX ст. з цэглы. Гэта двухпавярховы прамавугольны ў плане будынак з вольным дахам. З тарцоў да яго далучаюцца дзве прыбудовы, змураванныя на пачатку XX ст.

У комплекс Успенскага манастыра таксама ўваходзілі цагляная капліца пабудаваная ў другой палове XIX ст., жылыя дамы, якія ўзведзены адночасова з гаспадарчымі пабудовамі,. стайня, свіран.

Сёння комплекс уключае Успенскі сабор, манастырскі корпус з царквой, званіцу, школу, капліцу, дзве гаспадарчыя пабудовы і тры жылыя дамы. Займае значную тэрыторыю, абнесеную, з поўдня і захаду цаглянай сцяной, а з поўначы пасадкамі дуба, ліпы, асіны, з усходу - ровам, за якім месціцца сажалка. Ад брамы да манастырскага корпуса вядзе ліпавая алея.

У перыяд Вялікай Айчыннай вайны ў 1943 г. манастыр быў узарваны гітлераўцамі. На месцы храма засталіся руіны, але па захаваўшыхся дэталях бачна, што будаваўся ён як усякае збудаванне абарончага тыпу. Манастыр спраектаваны талентавітым архітэктарам і выкананы ўмелымі ў сваёй справе будаўнікамі.

## ГІСТОРЫЯ НЯСВІЖСКАГА АРХІВА КНЯЗЁЎ РАДЗІВІЛАЎ У 1790-1838 ГГ.

*А.М. Латушкін*
Навуковы кіраўнік – к.гіст.н., дацэнт ***С.М. Ходзін***
*Беларускі дзяржаўны універсітэт*

Род Радзівілаў – наймагутнейшы магнацкі род у Вялікім Княстве Літоўскім гербу "Тры Трубы", пасля падзелаў Рэчы Паспалітай – арыстакратыя Расіі, Прусіі, Аўстрыі. Пры вывучэнні гісторыі Беларусі кан. XIV – 30-х гг. XX стст. яны адыгрываюць важную, часам першарадную ролю адразу па некалькіх накірунках: 1). Кн. Радзівілы былі найбуйнейшымі землеўладальнікамі ў ВКЛ; вышэйшыя дзяржаўныя грамадзянскія і ваенныя пасады доўгі час належылі пераважна гэтаму роду; 3). Кн. Радзівілы знаходзіліся ў сваяцтве з манаршымі і іншымі знатнейшымі дамамі Еўропы і інш.

Архіў кн. Радзівілаў у Нясвіжы пачаў складацца з 1-й пал. XVI ст. і з таго часу за нешматлікімі выключэннямі знаходзіўся ў Нясвіжскім замку. Перыяд жа 1790 – 1838 гг. (ад часу смерці перадапошняга Нясвіжскага і Алыцкага ардыната Караля Станіслава Радзівіла і наступлення апекі над яго непаўнагадовым спадкаемцам пляменнікам Дамінікам і да спынення дзейнасці Радзівілаўскай Камісіі) для архіва быў адным з самых насычаных і лёсавызначальных, звязаных з яго перамяшчэннямі ў розныя месцы.